***Мурашка Н. У.**, магістрант;*
***Шылава А. С.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры менеджменту і адукацыйных тэхналогій Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі. Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка*

# Тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў: урокі беларускай мовы ў I класе

Тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве [1; 2] з'яўляецца альтэрнатыўнай традыцыйнаму навучанню малодшых школьнікаў на аснове атрымання гатовых ведаў і іх узнаўлення; дае магчымасць актывізаваць пазнавальную дзейнасць кожнага вучня ў адукацыйным працэсе.

Галоўная ідэя навучання ў супрацоўніцтве заключаецца ў тым, што малодшыя школьнікі вучацца разам, працуюць і дапамагаюць адзін аднаму, а не проста аднačасова выконваюць прапанаванае настаўнікам заданне.

Адной з важных праблем пры вывучэнні беларускай мовы з'яўляецца фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі. У межах вырашэння гэтай праблемы перад настаўнікам пастаўлены наступныя задачы [3, с. 32]:

- фарміраванне камунікатыўных уменняў і навыкаў навучэнцаў;
- развіццё практычных уменняў і навыкаў выкарыстання беларускай мовы ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці;
- развіццё творчых здольнасцей навучэнцаў пры стварэнні ўласных вусных і пісьмовых выказванняў.

У працэсе фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі на ўроках беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму настаўнік сутыкаецца з моўнымі і граматычнымі памылкамі вучняў у маўленні, падменай беларускага слова рускім і г. д., для ўстаранення якіх патрэбна пастаянная моўная практыка і час. Пры гэтым неабходна для кожнага вучня стварыць такія ўмовы, каб тут і цяпер ён авалодваў яшчэ новымі ведамі ў межах іншых кампетэнцый. У такім выпадку неабходна шукаць варыянты правядзення ўрокаў, калі ствараюцца ўмовы для разумення, асэнсавання, запамінання, замацавання новага матэрыялу кожным вучнем, умовы для моўнай практыкі **кожнага** вучня на **кожным** уроку. Неабходна, каб побач з вучнем, які дапускае памылкі, знаходзіліся яго сябры, заўсёды гатовыя прыйсці да яго на дапамогу, калі ён нешта не зразумеў ці ў яго ўзніклі цяжкасці пры выкананні задання.

У гэтым можа дапамагчы выкарыстанне на ўроках тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве.

**Мэтай навучання ў супрацоўніцтве** з'яўляецца не толькі авалоданне ведамі, уменнямі і навыкамі на ўзроўні, які адпавядае індывідуальным асаблівасцям развіцця, але і абуджэнне ўнутраных сіл і здольнасцей кожнага вучня, выкарыстанне ўсіх яго магчымасцей у мэтах усебаковага развіцця.

Пры тэхналогіі супрацоўніцтва паралельна з засваеннем новых ведаў адбываецца фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, фарміруюцца як камунікатыўныя і практычныя ўменні і навыкі выкарыстання беларускай мовы ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці, так і ўменні вучняў самастойна вучыцца, разам працаваць, вырашаць любыя праблемы, падзяляць радасць поспеху пры выкананні любога задання або горыч няўдачы; заўсёды быць гатовымі прыйсці на дапамогу адзін аднаму.

Акрамя таго, калі вучні, працуючы ў парах або групах, пачынаюць разумець, што ад кожнага з іх залежыць поспех працы групы, то ў іх фарміруецца адказнасць за свае поспехі і няўдачы, а таксама поспехі і няўдачы сваіх сяброў. Таму сумеснае навучанне больш эфектыўнае.

Тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве мае розныя варыянты, што дае шырокія магчымасці выкарыстання ў адукацыйным працэсе. У прапанаваным артыкуле мы разгледзім варыянт магчымасці выкарыстання тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве, які мае назву **«Навучанне ў камандзе»**. У I класе на ўроках беларускай мовы мы прапануем выкарыстоўваць яе на розных **этапах урока**: актуалізацыі ведаў і ўменняў, вывучэння новага матэрыялу, замацавання вывучанага матэрыялу.

Выкарыстанне дадзенай тэхналогіі на этапах урока абумоўлена спецыфікай навучання беларускай мове ў I класе ў школах з рускай мовай

навучання. Па-першае, курс з'яўляецца выключна моўным; па-другое, у большасці выпадкаў урокі ў гэтым курсе з'яўляюцца камбінаванымі; па-трэцяе, дзеці павінны навучыцца працаваць па дадзенай тэхналогіі, захоўваючы пры гэтым часовыя рамкі і тэмп урока.

**Этапы** (або алгарытм) рэалізацыі варыянту «Навучанне ў камандзе» можна прадставіць наступным чынам:

1) настаўнік тлумачыць вучням новы матэрыял або заданне;

2) настаўнік размяркоўвае вучняў на групы па чатыры чалавекі;

3) кожная група атрымлівае аднолькавыя заданні, якія арыентаваны на разуменне, запамінанне і замацаванне новага вучэбнага матэрыялу, г. зн. арганізуецца праца па фарміраванні асновы дзеянняў для кожнага вучня;

4) кожны вучань у групе самастойна выконвае адно з прапанаваных заданняў;

5) усе выкананыя заданні ў групе тлумачацца ўслых кожным вучнем па чарзе (мэтазгодна пачынаць тлумачэнне з больш моцнага вучня), астатнія ўдзельнікі групы кантралююць тлумачэнне таго, хто выступае;

6) калі ў каго-небудзь з удзельнікаў групы ўзнікалі цяжкасці або былі дапушчаны памылкі, астатнія дзеці прыходзяць на дапамогу: спрабуюць высветліць прычыну дапушчанай памылкі, тлумачаць вывучаны матэрыял і патрабуюць паўторнага тлумачэння выконваемых дзеянняў;

7) кожная група прадстаўляе вынікі сваёй працы.

Разгледзім варыянт «Навучанне ў камандзе», які можна выкарыстоўваць **на этапе актуалізацыі ведаў і ўменняў** вучняў пры вывучэнні ***тэмы «Я і навакольны свет. Поры года і заняткі людзей»***. Тут мы разгледзім прыклад знаёмства дзяцей з працай па тэхналогіі.

**Першы этап.**

***Настаўнік (Н.):*** Зараз я прапаную вам навучыцца працаваць у камандзе. Для гэтага мы з вамі падзелімся на каманды.

**Другі этап.** Настаўнік размяркоўвае вучняў на групы па чатыры чалавекі. Трэба ўлічваць, што ў кожнай групе павінны быць хлопчыкі і дзяўчынкі, а таксама вучні з высокім і нізкім узроўнямі матывацыі. Для гэтага пажадана загадзя прадумаць, якімі спосабамі лепш разбіць вучняў на групы. Для першага разу можна выкарыстаць самы просты спосаб.

***Н.:*** Мы падзелімся на групы па чатыры чалавекі. Групуемся па дзве парты, якія стаяць адна за адной.

Калі пры дзяленні на групы па чатыры чалавекі, застаюцца адзін, два або тры вучні (гэта залежыць ад колькасці вучняў у класе, прысутных на ўроку), то вучняў з высокім узроўнем матывацыі можна прызначыць памочнікамі настаўніка, якія пры неабходнасці будуць аказваць дапамогу асобным групам.

**Трэці этап.** Настаўнік прысвойвае вучням групы нумары 1, 2, 3, 4.

***Н.:*** Вучань, які сядзіць на першай парце першага варыянту, — гэта вучань пад нумарам 1, за спінай у яго будзе вучань пад нумарам 2, справа ад вучня пад нумарам 2 будзе знаходзіцца вучань пад нумарам 3, і, нарэшце, перад вучнем пад нумарам 3 сядзіць вучань, які атрымлівае нумар 4. Вучні пад нумарам 1, падніміце, калі ласка, рукі! (Вучні падымаюць рукі, а настаўнік правярае, ці ўсе вучні яго правільна зразумелі.)

***Н.:*** Малайцы! Цяпер вучні пад нумарам 2.

***Н.:*** Якія вы разумныя! Цяпер вучні пад нумарам 3.

***Н.:*** Выдатна! І нарэшце, вучні пад нумарам 4.

***Н.:*** Малайчынкі! Вы ўсе выдатна мяне зразумелі.

**Чацвёрты этап.** Настаўнік размяркоўвае, хто з вучняў якое заданне будзе выконваць. На дошцы вывешаны зваротным бокам выявы хмары, парасона, ветру, снегу. А пад імі подпісы ў выглядзе першай і апошняй літар. На адваротным баку аркуша напісаны лічбы 1, 2, 3, 4 (мал. 1).




*Малюнак 1* — Выгляд аркушаў з адваротнага боку

***Н.:*** Вы бачыце, што на дошцы вісяць чатыры аркушы. На кожным аркушы — нумар. Гэты нумар адпавядае вашаму нумару: аркуш пад нумарам 1 для вучняў пад нумарам 1 і г. д. На аркушах адгадкі да загадак, а пад аркушамі падказка, як гэта называецца па-беларуску. Адгадваць загадкі мы будзем не зусім звычайна — групай. Цяпер мы гэтаму павучымся. Слухаць мяне трэба вельмі ўважліва. Усё зразумела?

***Вучні (В.):*** Так!

***Н.:*** Тады пачынаем!

**Пяты і шосты этапы.** Кожны ўдзельнік групы па чарзе пад кіраўніцтвам настаўніка выконвае заданне і дае свой адказ сябрам па групе, а астатнія вучні ў групе кантралююць правільнасць яго адказу.

***Н.:*** Вучні пад нумарам 1, падніміце рукі! (Вучні яшчэ раз паднімаюць рукі.) Малайцы! Гэта загадка для вас. Уважліва слухайце! Вы павінны яе разгадаць самастойна, а потым ціхенька назваць адгадку па-беларуску сваёй групе. Такім чынам вучні пад нумарам 1 адгадваюць загадку, а вучні пад нумарамі 2, 3, 4 слухаюць адгадку і, калі вучань пад нумарам 1 не ведае адказ, павінны яму дапамагчы. Усё робім ціха, кожная група працуе толькі са сваімі нумарамі. Гатовы?

***В.:*** Так!

***Н.:*** Загадка для вучняў пад нумарам 1 (настаўнік чытае):

Чарадзей з-за лесу грозны выплывае:
Заняла паўнеба барада сівая. *(Хмара.)*
*І. Муравейка* [4, с. 98]

Вучні пад нумарам 1 у кожнай групе выконваюць заданне, настаўнік адкрывае малюнак хмары (мал. 2).



*Малюнак 2* — Хмара

***Н.:*** Адгадалі? Цяпер вучань пад нумарам 1 паведамляе загадку сваім сябрам. Калі адгадка правільная, то ўсе маўчаць, калі не, то можна сябру падказаць. Удзельнікі групы адгадку ўслых не называюць. Вам трэба яе проста запомніць. Зрабілі?

***В.:*** Так!

***Н.:*** Малайцы! Загадка для вучняў пад нумарам 2. Вучні пад нумарам 2, падніміце рукі! (Вучні паднімаюць рукі.) Добра! Слухайце вашу загадку!

Найдабрэйшы ён характар мае.
Калі бесперапынку дожджілье,
Сам да апошняй ніткі прамакае,
А мне прамокнуць не дае. *(Парасон.)*
*І. Муравейка* [4, с. 98]

Вучні пад нумарам 2 у кожнай групе адгадваюць, настаўнік адкрывае карцінку з парасонам (мал. 3).



*Малюнак 3* — Парасон

***Н.:*** Цяпер вучань пад нумарам 2 ціхенька паведамляе сваю адгадку. Калі ён памыліўся, то вучні пад нумарамі 1, 3, 4 могуць яму дапамагчы. Гатовы?

***В.:*** Так!

***Н.:*** Малайцы! Загадка для вучняў пад нумарам 3. Вучні пад нумарам 3, падніміце рукі! (Вучні паднімаюць рукі.) Малайцы! Слухаем!

Хоць, здаецца, ледзьве дыша —
А ўжо мора ён калыша,
А як часам уздыхне —
Да зямлі дубы прыгне.
Хто нябачны той асілак,
Што такую мае сілу? *(Вецер.)*
*Н. Парукаў* [4, с. 97]

Вучні пад нумарам 3 у кожнай групе адгадваюць, настаўнік адкрывае карцінку з ветрам (мал. 4).

***Н.:*** Цяпер вучань пад нумарам 3 ціхенька паведамляе сваю адгадку. Калі ён памыліўся, то



*Малюнак 4* — Вецер

вучні пад нумарамі 1, 2, 4 могуць яму дапамагчы. Адгадалі?

***В.:*** Так!

***Н.:*** Малайцы! Загадка для вучняў пад нумарам 4. Вучні пад нумарам 4, падніміце рукі! (Вучні паднімаюць рукі.) Малайцы! Слухаем вашу загадку.

Белы, ды не цукар, ног няма, а ідзе. *(Снег.)* [4, с. 96].

Вучні пад нумарам 4 у кожнай групе адгадваюць, настаўнік адкрывае карцінку са снегам (мал. 5).



*Малюнак 5* — Снег

***Н.:*** Цяпер вучань пад нумарам 4 паведамляе сваю адгадку сябрам. Калі ён памыліўся, то вучні пад нумарамі 1, 2, 3 могуць яму дапамагчы. Адгадалі?

***В.:*** Так!

***Н.:*** Малайцы!

**Сёмы этап.** Кожная група прадстаўляе вынікі сваёй працы.

***Н.:*** Цяпер, калі ўдзельнікі ўсіх груп усё адгадалі, кожная прадставіць нам свае адказы. Пачынаем з групы нумар 1. Група ўстае і кожны вучань называе сваю адгадку. Адказ пачынаем са слоў: «На першую загадку адказ — ...» Адказваем па чарзе: спачатку вучань пад нумарам 1, потым пад нумарам 2, пасля пад нумарам 3 і 4. (Група адказвае.)

Затым па аналогіі свае адказы прадстаўляюць астатнія групы. Калі пры выкананні задання ў многіх вучняў узніклі цяжкасці, можна прапанаваць ім знайсці памылку.

Калі пры выкананні лёгкіх заданняў вучні асвоюць правілы «навучання ў камандзе», заданні можна ўскладняць.

Зараз разгледзім варыянт «Навучання ў камандзе» **на этапе вывучэння новага матэрыялу, *тэма «Я і мая школа. Вучэбныя рэчы»*.**

**Першы этап.** Настаўнік паказвае прадмет, вучні называюць яго па-руску, а настаўнік па-беларуску: *сшытак, падручнік, пенал, ручка, аловак, фламастар, гумка, ранец*. Калі вучні ведаюць назвы прадметаў па-беларуску, то трэба дазволіць ім выказацца. Затым настаўнік яшчэ раз паказвае гэтыя ж прадметы, а вучні хорам называюць па-беларуску і кладуць іх перад сабой. Пасля гэтага настаўнік арганізуе парную працу вучняў, якія сядзяць за адной партай, па завучванні беларускіх слоў.

Вучань, які сядзіць на першым варыянце, паказвае прадметы, якія ляжаць перад ім, а вучань, які сядзіць на другім варыянце, называе гэтыя прадметы па-беларуску. Затым вучні мяняцца ролямі.

**Другі этап.** Настаўнік размяркоўвае вучняў на групы па чатыры чалавекі.

**Трэці этап.** Настаўнік прысвойвае вучням групы нумары 1, 2, 3, 4. Пры размеркаванні нумароў неабходна ўлічваць складанасць задання. Настаўніку мэтазгодна прадумаць, хто якія заданні будзе выконваць, прычым найбольш складаныя з іх неабходна адрасаваць вучню з больш высокім узроўнем матывацыі, больш лёгкія — з нізкім, каб кожны вучань змог справіцца з прапанаваным заданнем, тым самым адчуць сітуацыю поспеху.

**Чацвёрты этап.** Настаўнік размяркоўвае, хто з вучняў якое заданне будзе выконваць:

✓ вучні пад нумарам 1 — знайсці і назваць такія прадметы, назвы якіх у рускай і беларускай мовах падобныя;

✓ вучні пад нумарам 2 — знайсці і назваць такія прадметы, назвы якіх у рускай і беларускай мовах адрозніваюцца;

✓ вучні пад нумарам 3 — назваць усе гэтыя прадметы адным словам;

✓ вучні пад нумарам 4 — знайсці і назваць такія прадметы, у назве якіх сустракаецца гук [г] [4, с. 18].

Вучні самастойна выконваюць заданні.

**Пяты этап.** Кожны ўдзельнік групы па чарзе спачатку паўтарае сваё заданне, потым дае свой адказ, а астатнія вучні кантралююць адказ вучня, які выступае. Праца ў групе (паўтарэнне заданняў, адказ), адбываецца наступным чынам: 1 → 2 → → 3 → 4 → 1.

**Шосты этап.** Праца над дапушчанымі памылкамі.

Трэба загадзя падрыхтаваць вучняў да таго, што ўсе ўдзельнікі групы могуць задаваць пытанні вучню, які адказвае, па яго матэрыяле. Калі вучань, адказваючы, адчувае цяжкасці, удзельнікі групы прыходзяць яму на дапамогу. Выглядаць гэта можа наступным чынам.

***В. 1:*** Мне трэба было знайсці і назваць такія прадметы, назвы якіх у рускай і беларускай мовах падобныя. Я знайшоў пенал, ручку, фламастар.

***В. 2:*** Ты прапусціў яшчэ адно слова. Гэта слова — ранец.

***В. 1:*** Ранец — гэта партфель па-беларуску.

***В. 2:*** А хіба ў беларускай мове няма такога слова?

***В. 1:*** А, так і ёсць, я зразумеў! Дзякуй, цяпер я гэта абавязкова запомню.

Вельмі добра, што вучні дапамагаюць адзін аднаму свядома засвоіць неабходны матэрыял, падбадзёрваюць і нават хваляць за правільнае выкананне хаця бы аднаго дзеяння; дамагаюцца таго, каб кожны вучань іх групы засвоіў неабходныя веды.

**Сёмы этап.** Кожная група прадстаўляе вынікі сваёй працы. Для эканоміі часу дадзены этап можна правесці таксама франтальна. Для гэтага настаўнік просіць падняць уверх прадметы-адказы на пытанне вучняў пад нумарам 1 і дае магчымасць самім вучням знайсці памылкі ў сябе або сваіх сяброў і выправіць іх, растлумачыць чаму, на іх думку, вучні з суседняй групы дапусцілі памылку. Затым па аналогіі свае адказы паказваюць вучні пад нумарам 2, 3, 4.

Разгледзім яшчэ адзін варыянт «Навучанне ў камандзе», які можна выкарыстоўваць **на этапе замацавання вывучанага матэрыялу**, ***тэма «Я і мая сям'я. Мае родныя»***.

**Першы этап.** Вучні слухаюць тэкст «Дзед Францішак і інтэрнэт», які чытае настаўнік [1, с. 32], пры гэтым разглядаюць малюнкі вучэбнага дапаможніка «Беларуская мова» [5, с. 16].

**Другі этап.** Настаўнік размяркоўвае вучняў на групы па чатыры чалавекі.

***Н.:*** Вы праслухалі тэкст, а цяпер я хачу абмеркаваць яго з вамі. Для гэтага мы падзелімся на групы па чатыры чалавекі.

**Трэці этап.** Па аналогіі, як у вышэйапісаных прыкладах.

**Чацвёрты этап.** Настаўнік размяркоўвае, хто з вучняў якое заданне будзе выконваць.

***Н.:*** Цяпер слухаем заданне:

✓ вучні пад нумарам 1 — адказваюць на пытанне: пра якіх сваякоў гаварылася ў тэксце?

✓ вучні пад нумарам 2: чаму сумавалі бабуля і дзядуля?

✓ вучні пад нумарам 3: з чым дзеці пазнаёмілі свайго дзядулю?

✓ вучні пад нумарам 4: што асвоіў дзядуля і чым гэта яму дапамагло?

Заданне ўсім зразумела?

***В.:*** *Так!*

***Н.:*** Прыступаем да выканання задання! На гэта ў вас 5 хвілін.

Вучні самастойна выконваюць заданні.

**Пяты і шосты этапы.** Кожны ўдзельнік групы спачатку паўтарае сваё заданне, а потым дае адказ на заданне, астатнія вучні кантралююць яго адказ. Калі вучань адчувае цяжкасці ў адказе на пытанне, удзельнікі групы прыходзяць яму на дапамогу.

***В. 1:*** Мне трэба было назваць сваякоў, пра якіх гаварылася ў тэксце. Гэта дзве ўнучкі, дзед, бабуля.

***В. 2:*** Ты прапусціў яшчэ двух.

***В. 1:*** Так, я ўспомніў. Гэта мама і тата.

***В. 2:*** Мне трэба расказаць аб тым, чаму сумавалі бабуля і дзядуля. Яны сумавалі па свайму дому.

***В. 3:*** Мне трэба было расказаць пра тое, з чым дзеці пазнаёмілі свайго дзядулю. Дзяўчынкі пазнаёмілі дзядулю з камп'ютарам, навучылі карыстацца інтэрнэтам і адпраўляць пісьмо па электроннай пошце.

***В. 4:*** Мне трэба было адказаць на пытанне аб тым, што асвоіў дзядуля і чым гэта яму дапамагло. Дзядуля асвоіў камп'ютар і інтэрнэт. Гэта дапамагло яму адправіць пісьмо па электроннай пошце.

***В. 1:*** Твой адказ такі ж самы, як у нумара 3. Так не павінна быць. Паўтарыце свае пытанні.

***В. 3:*** Мне трэба было расказаць пра тое, з чым дзеці пазнаёмілі свайго дзядулю.

***В. 4:*** Мне трэба было адказаць на пытанне, што асвоіў дзядуля і чым гэта яму дапамагло.

***В. 3:*** Я зразумеў! Мне трэба было адказаць, што дзяўчынкі пазнаёмілі дзядулю з камп'ютарам і інтэрнэтам.

***В. 4:*** А мне трэба было адказаць, што дзядуля асвоіў камп'ютар і электронную пошту. Гэта дапамагло яму адправіць пісьмо па электроннай пошце.

**Сёмы этап.** Кожная група прадстаўляе вынікі сваёй працы.

***Н.:*** Усе групы выканалі заданні?

***В.:*** Так!

***Н.:*** У такім выпадку пачынае сваё выступленне група 1. (Група можа быць абраная таксама шляхам жараб'ёўкі.) Нагадваю, што кожны з удзельнікаў прадстаўляе спачатку сваё пытанне, а потым адказ на яго. А ўсе астатнія павінны ўважліва слухаць і не перабіваць.

Выступае першая група.

***В. 1:*** Мне трэба было назваць сваякоў, пра якіх гаварылася ў тэксце. Гэта дзве ўнучкі, дзед, бабуля, мама і тата.

***В. 2:*** Мне трэба расказаць аб тым, чаму сумавалі бабуля і дзядуля. Яны сумавалі па сваім доме.

***В. 3:*** Мне трэба было расказаць пра тое, з чым дзеці пазнаёмілі свайго дзядулю. Дзяўчынкі пазнаёмілі дзядулю з камп'ютарам і інтэрнэтам.

***В. 4:*** Мне трэба было адказаць на пытанне, што асвоіў дзядуля і чым гэта яму дапамагло. Дзядуля асвоіў камп'ютар і электронную пошту. Гэта дапамагло яму адправіць пісьмо па электроннай пошце.

***Н. (звяртаецца да класа)***: Скажыце, калі ласка, першая група правільна адказала на пытанні?

***В.:*** Так!

***Н.:*** Тады выступае група пад нумарам 2.

Калі дзеці знаходзяць памылкі ў адказах сваіх аднакласнікаў, то можна іх не абмяркоўваць, а перайсці да выступлення той групы, якая знайшла памылку. Пасля выступлення ўсіх груп можна абмеркаваць з класам наступныя пытанні:

— Чые адказы былі найбольш поўныя?

— Якая група лепш за ўсіх гаварыла на беларускай мове? І г. д.

У дадзеным артыкуле мы разгледзелі фрагменты выкарыстання тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве на некаторых этапах урока беларускай мовы ў І класе. Праца па гэтай тэхналогіі фарміруе камунікатыўныя ўменні, развівае навыкі зносін, актывізуе мысліцельную і маўленчую дзейнасць, што ў выніку спрыяе фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Личностно ориентированные технологии обучения // Новые педагогические информационные технологии в системе образования : учеб. пособие для студ. пед. вузов и системы повыш. квалиф. пед. кадров / под ред. Е. С. Полат. — М. : Академия, 2000. — С. 203–247.
2. *Казимирская, И. И.* Обучение в сотрудничестве / И. И. Казимирская, А. В. Торхова // Организация и стимулирование самостоятельной работы студентов по педагогике : учеб. пособие. — Минск : Бестпринт, 2004. — С. 234–281.
3. Учебные программы по учебным предметам для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания: 1 класс / Министерство образования Республики Беларусь. — Минск : Нац. ин-т образования, 2017. — 139 с.
4. Беларуская мова : план-канспект урокаў : 1 клас / Н. У. Антонава, Г. А. Галяш. — Мінск : Аверсэв, 2017. — 144 с.
5. *Антонава, Н. У.* Беларуская мова : вучэб. дапам. для 1-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання : у 2 ч. / Н. У. Антонава, І. А. Буторына, Г. А. Галяш. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017. — 64 с. : іл.